**4 лістапада 2024 года**

# АДКРЫТЫ ЛІСТ

**Заклік да дзяржаў-удзельніц МКК далучыцца да звароту Літвы ў МКК з просьбай правесці расследаванне меркаваных злачынстваў супраць чалавечнасці, здзейсненых беларускімі ўладамі**

Ніжэйпадпісаныя арганізацыі грамадзянскай супольнасці заклікаюць дзяржавы-ўдзельніцы Міжнароднага крымінальнага суда (МКК) падтрымаць зварот Літвы ад 30 верасня 2024 года да Пракурора МКК і далучыцца да яго для расследавання меркаваных злачынстваў супраць чалавечнасці ў Беларусі.[i]

Ніжэйпадпісаныя арганізацыі, у рамках сваіх адпаведных паўнамоцтваў, у прыватнасці Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (IAPB),[ii] пададуць адпаведныя доказы і інфармацыю, сабраныя ў падтрымку папярэдніх расследаванняў, Канцылярыі Пракурора МКК і дзяржавам, што жадаюць дамагчыся перадачы справы ў суд.

Акрамя таго, мы заклікаем дзяржавы разгледзець і выкарыстаць усе іншыя даступныя спосабы прыцягнення да адказнасці за сур'ёзныя міжнародныя злачынствы, якія, паводле паведамленняў, былі здзейсненыя і працягваюць здзяйсняцца ў Беларусі і якія не з'яўляюцца прадметам гэтага звароту.

Перадгісторыя

Шырока прызнана, што Аляксандр Лукашэнка і яго ўрад, як мінімум з мая 2020 года, вядуць жорсткую кампанію супраць грамадзянскага насельніцтва Беларусі, якая ўключае сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека, у прыватнасці адвольныя затрыманні; палітычна матываваныя абвінавачванні; несправядлівыя судовыя працэсы; незаконныя забойствы; сэксуальны гвалт; катаванні і іншыя жорсткія, бесчалавечныя або зневажальныя віды абыходжання і пакарання; запалохванне і ціск; прымусовая праца; і гвалтоўныя знікненні.[iii]

Рэжым гвалтоўна перамясціў сотні тысяч законных жыхароў Беларусі ў суседнюю Літву і іншыя дзяржавы-ўдзельніцы альбо шляхам прамой высылкі, альбо з дапамогай прымусовых абставінаў, пра якія гаварылася вышэй. У сваім дакладзе за сакавік 2024 года Упраўленне Вярхоўнага Камісара па правах чалавека (УВКПЧ) адзначыла, што "да 300 000 чалавек былі вымушаныя пакінуць Беларусь з 2020 года ў рамках узгодненай кампаніі гвалту і рэпрэсій, наўмысна накіраваных супраць тых, хто выступае або лічыцца выступоўцам супраць урада або выказвае

крытычныя ці незалежныя погляды"[iv], спасылаючыся таксама на рэзалюцыю Еўрапейскага парламента[v] і даклад Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы.[vi]

Нават у выгнанні тыя, хто быў вымушаны пакінуць Беларусь, сутыкаюцца з сур'ёзнымі парушэннямі правоў чалавека: палітычна матываваныя крымінальныя абвінавачванні, завочныя судовыя працэсы і прысуды, пагрозы і запалохванне, у тым ліку ў дачыненні да родных, якія засталіся ў Беларусі, публічнае распаўсюджванне мовы варожасці, незаконны арышт і канфіскацыя маёмасці і іншыя формы грубага пазбаўлення асноўных правоў.[vii]

Падкрэсліўшы шырокамаштабны і сістэматычны характар цэлага шэрагу сур'ёзных парушэнняў, іх маштаб і характар, а таксама доказы афіцыйнай палітыкі ўладаў, УВКПЧ прыйшло да высновы, што "маецца дастаткова прыкмет, каб запатрабаваць далейшай ацэнкі наяўных доказаў з пункту гледжання прымяняльнага Міжнароднага крымінальнага права".[viii]

Паводле інфармацыі, сабранай Платформай, цяпер жыхары Беларусі знаходзяцца ў больш чым 25 дзяржавах-удзельніцах МКК, а таксама прынамсі ў 10 іншых дзяржавах, якія не ратыфікавалі Рымскі статут.

Зварот Літвы і наступныя крокі

У сваім звароце ад 30 верасня 2024 г. урад Літвы просіць Міжнародны крымінальны суд вывучыць, ці мае ён юрысдыкцыю на расследванне і судовы пераслед злачынстваў супраць чалавечнасці, у тым ліку дэпартацыі, пераследу і іншых бесчалавечных актаў, здзейсненых высокапастаўленымі службовымі асобамі Беларусі з 1 траўня 2020 года.[ix]

Згодна з Рымскім статутам, дэпартацыя або гвалтоўнае перамяшчэнне насельніцтва ўяўляюць сабой злачынства супраць чалавечнасці, калі яны здзяйсняюцца ў рамках шырокамаштабнага або сістэматычнага нападу на грамадзянскае насельніцтва. Дэпартацыя або гвалтоўнае перамяшчэнне вызначаецца як "гвалтоўнае перамяшчэнне асоб, якія падвергліся высяленню ці іншым прымусовым дзеянням, з раёна, у якім яны законна знаходзяцца, у адсутнасць падстаў, якія дапускаюцца міжнародным правам".[x] Пераслед вызначаецца як "наўмыснае і сур'ёзнае пазбаўленне асноўных правоў насуперак міжнароднаму праву па прыкмеце прыналежнасці да той ці іншай групы ці іншай супольнасці",[xi] а "іншыя бесчалавечныя дзеянні" - гэта дзеянні аналагічнага характару ў адносінах да іншых пералічаных злачынстваў супраць чалавечнасці, якія складаюцца ў наўмысным прычыненні моцных пакут або сур'ёзных цялесных пашкоджанняў або сур'ёзнай шкоды псіхічнаму або фізічнаму здароўю.[xii]

Як гаворыцца ў звароце, ёсць дастатковыя падставы меркаваць, што гэтыя дзеянні ўяўляюць сабой злачынствы супраць чалавечнасці, што былі здзейсненыя супраць грамадзянскага насельніцтва Беларусі высокапастаўленымі палітычнымі, праваахоўнымі і ваеннымі афіцыйнымі асобамі і ўяўляюць сабой "шырокамаштабны *і* сістэматычны напад на грамадзянскае насельніцтва ў рамках дзяржаўнай палітыкі па знішчэнні апазіцыі і іншадумства".[xiii] Літва падкрэсліла, што злачынствы, перададзеныя ў МКК, дагэтуль нідзе не расследаваліся.[xiv]

Хоць Рэспубліка Беларусь не з'яўляецца дзяржавай-удзельніцай Рымскага статута, МКК можа ажыццяўляць сваю юрысдыкцыю, калі хаця б частка дзеянняў здзяйсняецца на тэрыторыі дзяржавы-ўдзельніцы, як гэта было ў прэцэдэнце М'янмы/Бангладэш.[xv]

Пасля атрымання звароту Пракурор МКК пацвердзіў, што яго Канцылярыя правядзе папярэдні разгляд, каб ацаніць запыт у межах юрысдыкцыі МКК і вызначыць, зыходзячы з патрабаванняў заканадаўства, ці ёсць разумныя падставы для пачатку расследавання.[xvi]

Далучэнне да накіравання звароту

Урад Літвы ўзяў на сябе ініцыятыву і стаў першай дзяржавай, якая перадала беларускую сітуацыю ў МКК, што з'яўляецца важным крокам на шляху да спынення беспакаранасці.  Аднак гэты зварот стане значна мацнейшым, калі да яго далучацца іншыя дзяржавы.

Групавы зварот па сітуацыі ў Беларусі ўмацуе падтрымку запыту аб расследаванні меркаваных злачынстваў, учыненых беларускімі ўладамі, і пакажа, што іншыя дзяржавы гатовыя даць Суду адпаведныя матэрыялы або інфармацыю, якія могуць мець вырашальнае значэнне для расследавання, напрыклад, паказанні сведак. Папярэднія групавыя звароты з нагоды сітуацый ва Украіне (2022 год) і Венесуэле (2018 год) сталі для Пракурора пераканаўчым сігналам, што гэтыя злачынствы не могуць застацца па-за ўвагай.[xvii] Далучыўшыся да звароту Літвы, дзяржавы-ўдзельніцы МКК накіруюць адзіны сігнал аб тым, што міжнародная супольнасць не будзе цярпець беспакаранасці за падобныя злачынствы і што беларускі ўрад павінен неадкладна спыніць парушэнні міжнароднага права.

Нарэшце, далучыўшыся да звароту, дзяржавы-ўдзельніцы МКК накіруюць магутны сігнал пацярпелым і ахвярам парушэнняў правоў чалавека, многія з якіх па-ранейшаму падвяргаюцца пераследу, і прадэманструюць падтрымку беларускім праваабаронцам, якія ў цяперашні час знаходзяцца ў зняволенні. Больш за тое, гэта стане прызнаннем намаганняў беларускіх і міжнародных арганізацый грамадзянскай супольнасці і праваабаронцаў па дакументаванні меркаваных злачынстваў у Беларусі і выразам падтрымкі ў іх расследаваннях і судовым пераследзе злачынцаў на розных пляцоўках.

Як ужо гаварылася вышэй, многія жыхары Беларусі беглі на тэрыторыю іншых дзяржаў-удзельніц, гэтак жа як яны беглі ў Літву. У такіх выпадках далучэнне да звароту дазволіць дзяржавам-удзельніцам, на тэрыторыі якіх знаходзяцца сведкі, зрабіць свой унёсак у папярэдні разгляд, падзяліўшыся наяўнымі доказамі і інфармацыяй.

Захоўваецца неабходнасць правядзення нацыянальных расследаванняў і судовага пераследу

Акрамя магчымага расследавання ў Міжнародным крымінальным судзе, неабходна працягваць намаганні па барацьбе з беспакаранасцю таксама шляхам правядзення нацыянальных расследаванняў і судовага пераследу ў адпаведнасці з прынцыпамі ўніверсальнай юрысдыкцыі, з мэтай забеспячэння адпраўлення правасуддзя.

Хоць заклік да расследавання гэтых злачынстваў на міжнародным узроўні мае надзвычай важнае значэнне, факты сведчаць аб тым, што беларускі рэжым мог здзейсніць і іншыя міжнародныя злачынствы, якія не адносяцца да дадзенага звароту.  Да іх адносяцца такія злачынствы, як турэмнае зняволенне ці іншае суровае пазбаўленне фізічнай свабоды ў парушэнне асноватворных нормаў міжнароднага права, катаванні, сэксуальны і гендарны гвалт і гвалтоўныя знікненні. Акрамя далучэння і падтрымкі звароту Літвы, мы заклікаем усе дзяржавы працягваць свае намаганні на нацыянальным узроўні па прыцягненні да адказнасці за гэтыя злачынствы.

Ніжэйпадпісаныя арганізацыі, разам з IAPB, зноў заяўляюць аб сваёй гатоўнасці аказаць падтрымку або ўступіць у дыялог у сувязі з любымі падобнымі расследаваннямі.

Гэты адкрыты ліст быў падтрыманы наступнымі арганізацыямі:

1) DIGNITY - Дацкі інстытут супраць катаванняў
2) Еўрапейскі цэнтр па канстытуцыйных правах і правах чалавека (ECCHR)
3) Міжнародная федэрацыя правоў чалавека (FIDH)
4) Human Constanta
5) Міжнародная платформа па прыцягненню вінаватых да адказнасці для Беларусі (IAPB)
6) Інстытут па правах чалавека Міжнароднай асацыяцыі юрыстаў (IBAHRI)
7) Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі
8) Міжнароднае партнёрства за правы чалавека (IPHR)

9) Міжнародны савет па рэабілітацыі ахвяр катаванняў (IRCT)
10) Нарвежскі Хельсінкскі Камітэт
11) Сусветная Арганізацыя супраць катаванняў (OMCT)
12) REDRESS
13) Праваабарончы цэнтр "Вясна"

ЗАЎВАГІ:

[i] Літва накіроўвае сітуацыю ў Беларусі Пракурору Міжнароднага крымінальнага суда для расследавання злачынстваў супраць чалавечнасці, здзейсненых аўтарытарным рэжымам Лукашэнкі, Міністэрства юстыцыі Літоўскай Рэспублікі, 30 верасня 2024 г., Lithuania refers the Situation in Belarus to the Prosecutor of the International Criminal Court to investigate the crimes against humanity committed by the authoritarian regime of Lukashenko - The Ministry of Justice of the Republic of Lithuania (lrv.lt).

[ii] Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці ў Беларусі (IAPB) - гэта кааліцыя незалежных няўрадавых арганізацый (Вясна, Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, DIGNITY і REDRESS), якія збіраюць, кансалідуюць, верыфікуюць і захоўваюць доказы грубых парушэнняў правоў чалавека, якія з'яўляюцца злачынствамі па міжнародным праве, меркавана здзейсненых беларускімі ўладамі і іншымі асобамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, а таксама аказваюць падтрымку расследаванням нацыянальных органаў пракуратуры і міжнародных органаў па прыцягненні да адказнасці шляхам прадстаўлення доступу да сабраных доказаў і аналітыкі (https://iapbelarus.org/about/who-we-are/).

[iii] У тым ліку: Справаздача дакладчыка АБСЕ ў рамках Маскоўскага механізму аб меркаваных парушэннях правоў чалавека ў сувязі з прэзідэнцкімі выбарамі 9 жніўня 2020 года ў Беларусі (5 лістапада 2020 г., ODIHR.GAL/68/20/Corr.1, https://www.osce.org/files/f/documents/2/b/469539_0.pdf); Камітэт ПАРЕ па прававых пытаннях і правах чалавека (1 Красавік 2021, Doc. 15256, https://pace.coe.int/en/files/29094/html); Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі, даклад Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (4 мая 2022 года, A/HRC/50/58), https://documents.un.org/doc/undoc/gen/g22/332/24/pdf/g2233224.pdf); Даклад Вярхоўнага камісара ААН аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх (3 лютага 2023 г., A/HRC/52/68, https://documents.un.org/doc/undoc/gen/g23/008/97/pdf/g2300897.pdf); Даклад Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (3 мая 2023 г., A / HRC / 53 / 53, https://documents.un.org/doc/undoc/gen/g23/083/75/pdf/g2308375.pdf); Справаздача дакладчыка АБСЕ аб сур'ёзнай пагрозе чалавечаму вымярэнню АБСЕ ў Беларусі з 5 лістапада 2020 года (11 мая 2023 г., ODIHR.GAL/39/23/Corr.1, https://www.osce.org/files/f/documents/d/5/543240_0.pdf); Даклад Вярхоўнага камісара ААН аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх (25 сакавіка 2024 г, A/HRC/55 / 61, https://documents.un.org/doc/undoc/gen/g24/045/29/pdf/g2404529.pdf); Камітэт ААН супраць катаванняў, даклад Камітэта супраць катаванняў (21 чэрвеня 2024 г., A/79/44, https://digitallibrary.un.org/record/4053878/files/A_79_44-EN.pdf).

[iv] Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека, даклад аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і ў перыяд пасля іх, 25 сакавіка 2024 г., UN-Doc. A/HRC/55/61, прадстаўлены ў адпаведнасці з пунктам 47 рэзалюцыі 52/29 Савета па правах чалавека, у якім таксама ўтрымліваюцца спасылкі на дакументы A/HRC/52/68 і A/HRC/52/68/Corr.1, пункты 53 і 54.

[v] Даклад Вярхоўнага камісара ААН, сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, 25 сакавіка 2024 г., A/HRC/55 / 61, https://documents.un.org/doc/undoc/gen/g24/045/29/pdf/g2404529.pdf, пункты 47, 48.

[vi] Парламенцкая асамблея Рады Еўропы, даклад Вырашэнне асаблівых выклікаў, з якімі сутыкаюцца беларусы ў выгнанні, 5 чэрвеня 2023 г., дакумент 15783, https://pace.coe.int/en/files/31822/html#_TOC_d19e303.

[vii] Даклад Вярхоўнага камісара ААН аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, 25 сакавіка 2024 г., A/HRC/55/61, пункт 48, https://documents.un.org/doc/undoc/gen/g24/045/29/pdf/g2404529.pdf ; Даклад Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі Анаіс Марын, 9 мая 2024 г., A / HRC / 56/ 65, пункты 3, 24-28, https://documents.un.org/doc/undoc/gen/g24/072/84/pdf/g2407284.pdf.

[viii] Там жа.

[ix] https://tm.lrv.lt/en/news/lithuania-refers-the-situation-in-belarus-to-the-prosecutor-of-the-international-criminal-court-to-investigate-the-crimes-against-humanity-committed-by-the-authoritarian-regime-of-lukashenko/.

[x] Рымскі статут, артыкул 7(2)(d), https://www.icc-cpi.int/sites/default/files/2024-05/Rome-Statute-eng.pdf.

[xi] Рымскі статут, артыкул 7(2)(g), https://www.icc-cpi.int/sites/default/files/2024-05/Rome-Statute-eng.pdf.

[xii] Рымскі статут, артыкул 7(1)(k), https://www.icc-cpi.int/sites/default/files/2024-05/Rome-Statute-eng.pdf.
[xiii] Міністр юстыцыі Літоўскай Рэспублікі, прэс-рэліз, Літва перадае сітуацыю ў Беларусі Пракурору Міжнароднага крымінальнага суда для расследавання злачынстваў супраць чалавечнасці, здзейсненых аўтарытарным рэжымам Лукашэнкі, 30 верасня 2024 г., пункт 3, https://tm.lrv.lt/en/news/lithuania-refers-the-situation-in-belarus-to-the-prosecutor-of-the-international-criminal-court-to-investigate-the-crimes-against-humanity-committed-by-the-authoritarian-regime-of-lukashenko/.
[xiv] Выступ на сустрэчы ў амбасадзе Літвы ў Нідэрландах у Гаазе "Аб прававой рэакцыі міжнароднай супольнасці на злачынствы супраць чалавечнасці, учыненыя дзейным аўтарытарным рэжымам Беларусі " 1 кастрычніка 2024 г.
[xv] 14 лістапада 2019 года Палата папярэдняй вытворчасці МКК упаўнаважыла Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда (МКК) расследваць меркаваныя злачынствы, звязаныя з прымусовай дэпартацыяй рахінджа са штата Ракхайн у М'янме праз мяжу ў Бангладэш. (Рашэнне ў адпаведнасці з артыкулам 15 Рымскага статута аб санкцыянаванні расследавання сітуацыі ў Народнай Рэспубліцы Бангладэш / Рэспубліцы Саюз М'янма, 14 лістапада 2019 г., ICC-01/19-27, https://www.icc-cpi.int/court-record/icc-01/19-27).
[xvi] Заява Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда Карыма А. А. Хана аб атрыманні звароту ад Літоўскай Рэспублікі, 30 верасня 2024 г., https://www.icc-cpi.int/news/statement-icc-prosecutor-karim-aa-khan-kc-receipt-referral-republic-lithuania.
[xvii] 2 сакавіка 2022 года 39 дзяржаў-удзельніц МКК перадалі сітуацыю ва Украіне на разгляд МКК (Заява Пракурора МКК Карыма А. А. Хана аб сітуацыі ва Украіне: атрыманне зваротаў ад 39 дзяржаў-удзельніц і пачатак расследавання, https://www.icc-cpi.int/news/statement-icc-prosecutor-karim-aa-khan-qc-situation-ukraine-receipt-referrals-39-states). 11 сакавіка 2022 года Японія і Паўночная Македонія далучыліся да калектыўнага звароту, павялічыўшы агульную колькасць дзяржаў, якія звярнуліся, да 41, а Літва выступіла за правядзенне расследавання ў асобным звароце (Заява Пракурора МКК Карыма А. А. Хана аб сітуацыі ва Украіне: дадатковыя звароты ад Японіі і Паўночнай Македоніі; адкрыты партал для прадастаўлення інфармацыі). Падобным чынам, у 2018 годзе шэсць дзяржаў-удзельніц МКК перадалі сітуацыю ў Венесуэле ў Канцылярыю Пракурора, выказаўшы падтрымку расследаванню (Заява Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда Фату Бенсуды аб перадачы групай з шасці дзяржаў-удзельніц сітуацыі ў Венесуэле, 27 верасня 2018 г., https://www.icc-cpi.int/news/statement-prosecutor-international-criminal-court-fatou-bensouda-referral-group-six-states).